Формирование системы специализированных органов НКВД/МВД по борьбе с подростковой преступностью, беспризорностью и безнадзорностью было завершено в 1943 г., когда приказом НКВД СССР № 0246 от 21 июня 1943 г. для координации деятельности всех органов и подразделений милиции было создано специальное подразделение – Отдел НКВД СССР по борьбе с детской безнадзорностью и беспризорностью. Отделы и отделения создавались в республиканских наркоматах и областных УНКВД. Отдел НКВД БССР был создан 1 сентября 1943 г., а его деятельность стала разворачиваться с 28 октября 1943 г. В 1946 г. численность отдела составляла 23 сотрудника и по 2 сотрудника в каждом из 11 областных управлений (всего 45 человек). Сотрудники отдела в соответствии с приказом НКВД БССР должны были анализировать состояние уголовной преступности среди несовершеннолетних, выяснять ее причины, принимать меры к ее устранению, проводить мероприятия по предупреждению и ликвидации детской преступности, безнадзорности и беспризорности. На практике сотрудники отдела и отделений в областях координировали всю работу по борьбе с подростковой преступностью, поиску и изъятию беспризорников, размещению их в приемники-распределители; контролировали детские дома Министерства просвещения, систему патроната, руководили организацией и повседневной деятельностью детских приемников-распределителей, трудовых и воспитательных колоний, занимались трудовым и бытовым устройством бывших воспитанников колоний и многим другим. К концу 1944 г. благодаря усилиям сотрудников НКВД было создано 20 приемников-распределителей, установлены и учтены 43 432 безнадзорных и беспризорных, из них устроены 36 625.

Структура отдела НКВД/ МВД БССР включала несколько отделений и групп – учебно-воспитательное, производственное, снабжения, санитарное, финансовое и др. В декабре 1950 г. отдел МВД БССР по борьбе с детской безнадзорностью и беспризорностью был переименован в отдел детских колоний, а 28 марта 1953 г. ОДК МВД БССР был передан в ведение Минюста БССР. В первые послевоенные годы отдел МВД БССР действовал как единый координационный центр по борьбе с беспризорностью и безнадзорностью несовершеннолетних. В 1943–1953 гг. специализированные подразделения НКВД/МВД претерпели ряд организационно-структурных изменений, накопили большой положительный опыт работы в деле ликвидации детской беспризорности и преступности.

УДК 94(476)«17–18»

***А.У. Ерашэвіч***

## ГАРАДСКАЯ ПАЛІЦЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XIX ст.: ЗМЕНЫ Ў АРГАНІЗАЦЫЙНА-ШТАТНАЙ СТРУКТУРЫ І ЎТРЫМАННІ

Устанаўленне аб губернях 1775 г. вылучыла гарадскую і павятовую паліцыю. Арганізацыйная структура і дзейнасць апарату гарадской паліцыі рэгламентавалася Статутам добрапрыстойнасці ці паліцэйскім ад 8 красавіка 1782 г., у адпаведнасці з якім ствараліся ўправы добрапрыстойнасці, ці паліцэйскія, якія ўзначальвалі паліцмайстры ў губернскіх гарадах, гараднічыя і каменданты – у павятовых. Губернскія гарады, у якіх налічвалася больш за 4 тыс. двароў, падзяляліся на часткі (ад 200 да 700 двароў у кожнай) на чале з прыватнымі прыставамі, якія зацвярджаліся губернскім праўленнем па прадстаўленню гараднічага і мелі ўласную канцылярыю. Часткі, у сваю чаргу, уключалі кварталы (ад 50 да 100 дамоў у кожнай) на чале з квартальнымі наглядчыкамі, якім падпарадкоўваліся выбрныя на тры гады квартальныя паручнікі і радавыя паліцэйскія будачнікі. Дзеянне Паліцэйскага статута 1782 г. паступова пашыралася на ўсе губернскія гарады, аднак рэалізацыя яго палажэнняў зацягвалася.

Імператар Павел I рэарганізаваў сістэму ўтрымання гарадской паліцыі шляхам спынення асігнаванняў з дзяржаўнага казначэйства за кошт гарадскіх даходаў. Імянным указам ад 18 снежня 1797 г. раскладка неабходных сум збораў на ўтрыманне гарадской паліцыі даручалася магістратам і думам пад наглядам губернатараў. У адпаведнасці з сенацкагім указам ад 31 мая 1799 г. аб уладкаванні гарадской паліцыі быў вызначаны прыкладны штат і памеры грашовых расходаў па ўтрыманню паліцыі ў губернскіх гарадах.

У цэлым пры Паўле I асноўная частка грашовых асігнаванняў на ўтрыманне паліцыі ў беларускіх губернскіх гарадах паступала з гарадскіх даходаў. Так, у Магілёве з агульнай сумы 1 600 р. з дзяржаўнага казначэйства выдзялялася 430 р. (26,9 %) (на жалаванне гараднічаму 300 р., на ўтрыманне канцылярскіх служыцеляў 130 р.), а з гарадской думы – 1 170 р. (73,1 %) (на жалаванне 2 прыватным прыставам па 200 р., 4 квартальным наглядчыкам па 120 р., на канцылярскія выдаткі гарадской паліцыі, 2 частак, канцылярскіх служачых 290 р.).

У некаторых гарадах Літоўскай губерні (Вільня, Гродна, Брэст, Кобрын, Пружаны, Навагрудак, Коўна, Цельшы) былі заснаваны органы гарадской паліцыі. У былых старосцінскіх ці памешчыцкіх гарадах (Ашмяны, Свянцяны, Відзы, Ваўкавыск, Ліда, Слонім) адсутнічалі пасады гараднічых, а дзейнічалі толькі штатныя вайсковыя каманды пад кіраўніцтвам земскіх выпраўнікаў.

Такім чынам, Павел I падпарадкаваў гарадскую паліцыю губернскіх гарадоў ваенным губернатарм ці ваенным камендантам, якім у дапамогу прызначаліся паліцмайстры. У павятовых гарадах паліцэйскія функцыі выконвалі гараднічыя сумесна з магістратамі і ратушамі, якім павінны былі дапамагаць прыватныя приставы і квартальныя наглядчыкі. Частка гарадскіх даходаў стала асноўнай крыніцай задавальнення выдаткаў па ўтрыманню гарадской паліцыі.

Наступны расійскі імператар Аляксандр I вярнуўся да кацярынінскіх прынцыпаў арганізацыі органаў выканаўчай грамадзянскай паліцыі. Ён падпарадкаваў гарадскую паліцыю ваенным губернатарам, упраўляючым грамадзянскай часткай (адпаведна пасадзе генерал-губернатара паводле Устанаўлення аб губернях 1775 г.), ваенным губернатарам, якія не мелі грамадзянскай улады, і камендантам (на правах былых обер-камендантаў паводле Паліцэйскага статута), у выпадку адсутнасці камендантаў – гараднічым (залежылі ад ваенных ці грамадзянскіх губернатараў і губернскіх праўленняў). Шэфы палкоў, камандзіры батальёнаў і палкоў і іншыя вайсковыя начальнікі не маглі цяпер кіраваць гарадской паліцыяй.

Наступны імператарскі ўказ ад 24 кастрычніка 1803 г. дапаўняў, удакладняў, тлумачыў ведамасную падсправаздачнасць гарадскіх паліцый, якія кіраваліся living рознымі ўладнымі структурамі. З гэтага часу кіраванне гарадской паліцыі, непасрэдна падпарадкаванай ваенным ці грамадзянскім губернатарам, замест гараднічых і камендантаў даручалася паліцмайстрам, якія прызначаліся Сенатам з былых чыноўнікаў у ваеннай ці грамадзянскай службе па прадстаўленню міністра ўнутраных спраў, пераважна з асобаў, зацвярджаемых губернатарамі. Паліцмайстры незалежна ад наяўнага класнага чына да выдання падрабязных паліцэйскіх правілаў павінны былі атрымліваць жалаванне ў залежнасці ад прасторы гарадоў, колькасці жыхароў у іх і ў памерах гарадскіх даходаў.

Як і раней, утрыманне паліцыі адбывалася пераважна за кошт гарадскіх даходаў, але для кожнага горада вызначаліся асобныя штаты паліцыі і патрэбныя сумы яе грашовага забеспячэння. Імператар Аляксандр I зацвердзіў штаты паліцыі Мінска (1803 г.), Віцебска і Магілёва (1804 г.), Полацка, Мсціслаўля, Чавусаў, Веліжа (1805 г.), Вільні, Гродна, Коўна (1807 г.).

Паводле зацверджаных штатаў начальнікамі паліцыі ў гарадах абвяшчаліся паліцмайстры. Ва ўсіх губернскіх гарадах ім дапамагалі прыставы (аднак не размяжоўваліся пасады прыставаў крымінальных і грамадзянскіх спраў), ва ўсіх губернскіх і павятовых гарадах – квартальныя наглядчыкі і розныя канцылярскія служыцелі. На ўтрыманне гарадской паліцыі Вільні выдаткоўвалася 4 900 р., Гродна – 3 220 р., Віцебска і Магілёва – па 3 180 р., Мінска – 1 870 р., Полацка – 1 200 р., Мсціслаўля і Чавусаў – па 830 р. Заўважым, што падобныя асігнаванні не заўсёды ўлічвалі прастору горада, колькасць, шчыльнасць, саслоўна-сацыяльны склад насельніцтва ў іх, велічыню гарадскіх прыбыткаў і інш.

Імянным указам ад 24 лістапада 1815 г. па прадстаўленню мінскага грамадзянскага губернатара імператар зацвердзіў пастанову Камітэта міністраў аб заснаванні паліцыі ў заштатных гарадах Нясвіжы, Радашковічах і мястэчку Друі Мінскай губерні. Мясцовыя жыхары павінны былі збіраць штогод на ўтрыманне паліцыі ў Нясвіжы 730 р., Радашковічах – 510 р., Друі – 590 р. Аднак у 1816 г. у Нясвіжы і Друі паліцыя скасоўвалася, паколькі была заснавана пасля 1812 г. Таму ў канцы 1816 г. быў удакладнены вызначаны штат паліцыі толькі для казённага горада Радашковічаў. Акрамя ранейшага ўзносу ў памеры 510 р. для ўтрымання паліцмайстра меркавалася сабраць 250 р., канцылярскіх служыцеляў і расходы – 120 р., квартальнага наглядчыка – 120 р., якія да таго ж меў права вызначаць штогод у лістападзе на канцылярских служыцеляў і дробныя расходы 20 р.

У гарадах Беларусі ў першай чвэрці XIX ст. налічвалася 43 штатныя пасады гараднічых і паліцмайстраў (5 у Гродзенскай губерні, 4 – у Віленскай, 10 – у Мінскай, па 12 – у Віцебскай і Магілёўскай). Як і раней, у прыватнаўласніцкіх павятовых цэнтрах Гродзенскай і Віленскай губерняў паліцэйскія абавязкі выконвалі земскія выпраўнікі.

У цэлым натуральнае матэрыяльнае і грашовае забеспячэнне служачых чыноў паліцыі заставалася нізкім і недастатковым. Мізэрныя аклады паліцэйскіх службоўцаў не замінялі магчымасці атрымання імі дадатковых незаконных даходаў. У той жа час па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў у каштарысы гарадскіх расходаў сталі ўключацца спецыяльныя разнавіднасці артыкулаў, звязаныя з утрыманнем гарадской паліцыі (штатнае жалаванне, грошы на правіянт, абмундзіраванне, фураж, утрыманне пажарнага інвентару, на дровы і свечкі і інш.). Дакументы сведчаць аб фактах неатрымання жалавання з гарадской думы паліцэйскімі служыцелямі Полацка ў 1816 г., недахопе належнай штатнай сумы для ўтрымання пры пасадах канцылярскіх служыцелей гарадской паліцыі Віцебска і інш.

Такім чынам, урад Аляксандра I прыклаў шмат намаганняў для арганізацыйна-штатнага ўмацавання гарадской паліцыі, асабліва ў губернскіх цэнтрах. Указ 1803 г. «Аб сродках да выпраўлення паліцыі ў гарадах» упарадкаваў і ўніфікаваў сістэму кіравання гарадской паліцыі, размежаваў функцыі вайсковых і гарадскіх паліцый. Ва ўсіх беларускіх губернскіх гарадах былі прызначаны паліцмайстры. Але павольны працэс падрыхтоўкі, складання і зацвярджэння новых штатаў паліцыі не закрануў большасці павятовых гарадоў. Фінансаванне органаў гарадской паліцыі ажыццяўлялася пераважна за кошт сродкаў, якія паступалі з гарадскіх дум.

УДК 351.74

***А.В. Ермолаев***

## ФОРМИРОВАНИЕ ПРАВОВЫХ И ОРГАНИЗАЦИОННЫХ ОСНОВ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ СОТРУДНИКОВ БЕЛОРУССКОЙ МИЛИЦИИ (1991–2002 гг.)

В современных условиях успешная реализация задач по борьбе с преступностью, охране общественного порядка и обеспечению общественной безопасности невозможна без формирования высокопрофессионального кадрового потенциала органов внутренних дел. Одной из функций Министерства внутренних дел Республики Беларусь как республиканского органа государственного управления, возглавляющего систему органов внутренних дел и внутренних войск, является обеспечение реализации государственной кадровой политики, а также государственной политики в области образования.

Основы профессионального образования сотрудников белорусской милиции закладывались в рамках создания и развития системы подготовки кадров для органов внутренних дел Советского государства. Вместе с тем вот уже более 25 лет из почти вековой истории милиции в Беларуси происходит формирование собственной системы профессиональной подготовки сотрудников внутренних дел. В этой связи представляет интерес изучение процесса формирования правового и организационного обеспечения ведомственного профессионального образования в условиях существования суверенного белорусского государства.

Одним из основополагающих нормативных правовых документов, заложивших основу функционирования органов внутренних дел Беларуси, является Закон Республики Беларусь от 25 августа 1991 г. № 1015-XII «О некоторых изменениях в системе государственного управления Республики Беларусь», в соответствии с которым МВД преобразовывалось из союзно-республиканского министерства в республиканское с подчинением ему внутренних войск и учебных заведений МВД СССР, расположенных на территории республики. Таким образом, основу ведомственного профессионального образования составили 3 учебных заведения МВД СССР, функционировавших в то время в республике: Минская высшая школа, Минская специальная средняя школа милиции имени М.В. Фрунзе и Могилевская специальная средняя школа транспортной милиции.

В соответствии с Законом Белорусской ССР от 26 февраля 1991 г. № 637-XII «О милиции» высшие и средние специальные учебные заведения МВД были включены в состав специальной милиции. Как отмечает К.И. Барвинок, МВД Беларуси вынуждено было взяться за выполнение новых функций. В частности, к компетенции министерства была отнесена организация подготовки кадров милиции в учебных заведениях министерств внутренних дел. Кроме этого, в Положении о МВД, утвержденном постановлением Совета Министров Беларуси от 24 марта 1992 г. № 151, в качестве одной из функций было закреплено проведение подготовки и переподготовки специалистов с высшим средним специальным образованием.

В этой связи в условиях поиска путей формирования собственной системы подготовки кадров и интеграции ее в систему образования страны по инициативе МВД Советом Министров Беларуси 24 марта 1992 г. было принято постановление № 152 «Об образовании Академии милиции МВД». Согласно указанному нормативному акту новое учебное заведение создавалось с 1 апреля